# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

29 чэрвеня 2018 г. № 26 (459)




стар. 2

**Святло паставілі на «паўзу»**



стар. 14

**Хоцімскі варыянт дапамогі**



стар. 16

**Нормы для прыватнага сектара**

ТЭМА НУМАРА

# ФОРМА І ЗМЕСТ

## Як адна мясцовая ініцыятыва стала штуршком да грамадскай актыўнасці жыхароў пасёлка



**Формы работы дэпутатаў мясцовых Саветаў бываюць розныя. Найчасцей даводзіцца чуць, што галоўнай задачай народнага абранніка становіцца работа з насельніцтвам. Але ж дэпутат сельскага Савета не ладзіць прыёмы выбаршчыкаў, як парламентарый, — у яго няма такой патрэбы, бо ён бачыцца з выбаршчыкамі ледзь не кожны дзень. Тады што лічыць работай з насельніцтвам? Напэўна, канкрэтную справу, да якой здольны заахвоціць жыхароў народны абраннік і якую можа ўзначаліць сам. Калі дэпутацкая ідэя выліваецца ў пэўную карысную грамадскую справу — гэта ёсць вынік правільна пастаўленай работы з насельніцтвам. Так выйшла і ў невялічкім пасёлку Кобрынскага раёна з крыху дзіўнай назвай Птушкафабрыка.**



### Спачатку было слова. Дэпутата

Спачатку была ідэя **дэпутата Батчынскага сельскага Савета Алы САПЯЖЫНСКАЙ** наконт гранта — а цяпер яна ператварылася... у цудоўную пляцоўку для адпачынку дзяцей і дарослых з арэлямі, батутам, спартыўнымі збудаваннямі. І гэта далёка не канец праекта, гавораць мясцовыя жыхары.

— А пачыналася ўсё з сельскага сходу, — згадвае **старшыня Батчынскага сельскага Савета Святлана ГАНГАЛА.** — На адным са сходаў жыхароў Птушкафабрыкі людзі настойліва прасілі, каб сельвыканкам абсталяваў хоць бы зусім невялікую дзіцячую пляцоўку: маўляў, нашы дзеці не маюць магчымасці нават у пяску пагуляць, не кажучы ўжо пра іншыя забавы. А чым яны горшыя за гарадскіх? Я тады падумала, што давядзецца паставіць дзве лаўкі, пясочніцу і тым абмежавацца. Бо на большае ў мясцовага органа ўлады проста грошай не было.

Але выступіла дэпутат Ала Сапяжынская, расказала пра кобрынскі клуб дзелавых жанчын «Бона», пра яго цікавыя справы і прапанавала праз гэтую грамадскую арганізацыю падаць заяўку на грант.

стар. 5

АКЦЭНТЫ

# БАЧЫЦЬ МАШТАБНА,

## знаходзіць пункты росту рэгіёнаў



**Выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое прайшло ў Гродзенскай вобласці, вызначыла першачарговыя задачы ў рабоце мясцовых Саветаў на найбліжэйшую перспектыву. Аб павышэнні адказнасці дэпутацкага корпуса ў рэгіёнах і шляхах вырашэння набалелых праблем інтэрв'ю старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.**

**— Аляксандр Андрэевіч, аналізуючы вынікі нядаўняга выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Гродзенскай вобласці, што вы адзначылі б у першую чаргу?**

— Галоўны прыярытэт у фарміраванні эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі — чалавек з яго праблемамі і патрэбамі. Гэты пастулат быў узяты за аснову пры падрыхтоўцы пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, якое адбылося ў Гродзенскай вобласці. У рамках выканання пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі Савет Рэспублікі ў тры этапы праводзіць пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, прысвечаныя павышэнню ролі мясцовых органаў улады ў фарміраванні эфектыўнай эканомікі на рэгіянальным узроўні і паляпшэнні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Першае пасяджэнне адбылося ў Слаўгарадзе ў канцы красавіка. Разам з актывам Магілёўскай і Гомельскай абласцей мы абмеркавалі тэму павышэння ролі органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў устойлівага развіцця рэгіёнаў. У Ашмяны і Астравец мы запрасілі кіраўнікоў Саветаў дэпутатаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей і зрабілі акцэнт на праблемах павышэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў і прыцягнення інвестыцый у эканоміку мясцовых бюджэтаў. Наступнае пасяджэнне ў найбліжэйшы час плануем правесці ў Барысаве, каб працягнуць размову па пытаннях фарміравання рэгіянальнай палітыкі са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў ужо Мінскай і Віцебскай абласцей.

Гаварыць сумленна і адкрыта пра набалелыя праблемы — першапачаткова зададзеная танальнасць удзельнікаў усіх пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. У цэлым у краіне, нягледзячы на дасягнутыя поспехі апошніх гадоў, — нізкі ўзровень інфляцыі, аднаўленыя аб'ёмы экспарту, паляпшэнне структуры плацежнага балансу, — застаецца нявырашаным шэраг сацыяльна-эканамічных праблем.

стар. 3